● Да 45-годдзя Перамогі

19 красавіка 1990 г.

# Не старэе душой ветэран

На самым ускрайку вёскі Баханы стаіць звычайны драўляны дом. З выгляду яму ўжо некалькі дзесяткаў гадоў. Аднак дом пабудаваны трывала, грунтоўна. І таму стаіць ён, хоць і крануты часам, таксама цвёрда.

Жыве тут ветэран Вялікай Айчыннай вайны Піліп Трафімавіч Яненка. Складаны жыццёвы лёс у яго. Але не старэе душой ветэран. Часам успомняцца яму франтавыя гады, развярэдзяць душу. А ўспомніць ёсць што салдату Вялікай Айчыннай...

Самы цяжкі бой запомніўся Піліпу Трафімавічу на рацэ Проня. Фашысты ўмацаваліся на другім беразе яе. Задача стаяла такая: выбіць ворага і гнаць яго з роднай зямлі. Але лёгка сказаць: выбіць. Вакол роўнае месца, наступаць цяжка. Выручылі нашы кулямётчыкі, сярод якіх быў і Піліп Трафімавіч. Яны адкрылі прыцэльны агонь па варожых агнявых кропках. І многія гэтыя кропкі былі знішчаны. Гэта дало магчымасць нашым войскам на тым участку неўзабаве фарсіраваць раку і замацавацца на другім яе беразе. За гэты бой Піліп Трафімавіч быў удастоены ордэна Чырвонай Зоркі.

— А вось медаль «За адвагу» атрымаў у баях за ўзяцце горада Кёнігсберга,— расказвае Піліп Трафімавіч.— Жорстка супраціўляўся вораг. Аднак ужо ніштo нас не магло спыніць. І мы гналі фашыстаў усё далей і далей.

Аднак самому Піліпу Трафімавічу не давялося далей ісці. У адным з баёў ён быў паранены. Гэта не першае раненне, але яно надоўга прыкавала салдата да шпітальнага ложка. І таму Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі.

Дэмабілізаваўся Яненка ў канцы верасня 1945 года. Прыйшоў дадому ў Баханы і пачаў разам з усімі аднаўляць разбураную вайной сельскую гаспадарку. Пачаў працаваць у жывёлагадоўлі калгаса. Разам з жонкай Марыяй Паўлаўнай выхавалі пяць дзяцей. Ішоў час. Дзеці разляцеліся па свету. Сын Васіль жыве ў Данецку, ажаніўся, мае сваю сям'ю. Адна дачка жыве ў Палтаўскай вобласці, другая ў Магілёве, дзве ў Хоцімску.

Раненні, кантузіі рэзка пагоршылі стан здароўя Піліпа Трафімавіча. І ён прызнаецца інвалідам Вялікай Айчыннай вайны другой групы.

— Працаваў я колькі мог,— гаворыць Піліп Трафімавіч.— Не цураўся любой работы. І жывёлу даглядаў, і пастухом быў. Але сілы здаюць. І я вельмі ўдзячны нашай дзяржаве за тое, што дала мне ваенную пенсію.

Як рэліквію захоўвае ветэран медаль «Ветэран працы». Гэтая мірная ўзнагарода ўдвая для яго радасная: атрымана яна на мірнай зямлі і за мірную работу.

Пытаюся ў Піліпа Трафімавіча, а што б вы пажадалі нашай моладзі ў наш складаны час?

— Толькі міру на зямлі. І няхай нашы маладыя салдаты пільна стаяць на рубяжах роднай Айчыны,— адказаў ветэран. Жудасы вайны мы бачылі рэальна. Няхай жа моладзь не зведае іх. Трэба радавацца мірнаму жыццю. Мы ў міры жывём ужо 45 гадоў. І якое гэта шчасце!

Часта да Яненкі прыязджаюць унукі. І тады ў пярэднім светлым пакоі яго дома гучыць звонкі дзіцячы смех. А гэта — прадаўжэнне жыцця.

— Ведаеце,— гаворыць Піліп Трафімавіч,— гледзячы на ўнукаў і паміраць не хочацца.

Задаю яшчэ адно пытанне: а як будзеце сустракаць Дзень Перамогі?

— Гэтае свята мы, ветэраны, ды і ўсе савецкія людзі, будзем памятаць назаўсёды,— пранікнёна адказвае Піліп Трафімавіч. — Сустрэнем яго з радасцю, успомнім франтавых сяброў, баявыя шляхі-дарогі, нашы страты і нашы перамогі. І будзем жыць з верай у сэрцы, што новай вайны ніколі не будзе. Вось я атрымаў і яшчэ адзін ордэн — ордэн Вялікай Айчыннай вайны першай ступені. Дарагая ўзнагарода. Але яна была б даражэйшая, калі б была за мірную працу.

Вось так і жыве ветэран. Мірнага неба Вам, Піліп Трафімавіч!

І. ЦІТОЎ.

**Цітоў, І. Не старэе душой ветэран** : жыццёвы лёс ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Піліпа Трафімавіча Яненка / І. Цітоў // Шлях Кастрычніка. — 1990. — 19 красавіка. — С. 2.